Эмоцыя сораму рэгулюе паводзіны чалавека ў адпаведнасці з грамадскімі нормамі. Эмоцыя неаднолькава праяўляе сябе ў розных людзей, і згодна з заўвагай К. Ізарда, «парог сораму карэлюе з чуллівасцю да пачуццяў і меркаванняў навакольных. Пагарда, насміханне з іншых або сябе самога можа актывізаваць сорам. Пачуццё таго, што чалавек або нейкія рысы яго неадэкватныя, недарэчныя або непрыстойныя – другая перадумова перажывання сораму» [1, с. 348].

Праекцыя значэнняў з матэрыяльных сфер на псіхічную дзейнасць чалавека адлюстроўваецца з уключэннем метафар, якія даюць магчымасць выражаць убачанае праз унікальнае індывідуальнае (культурнае) бачанне свету.

## Літаратура


1. *Изард, К.* Эмоции человека / К. Изард. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1980. – 440 с.
2. *Ильин, Е. П.* Эмоции и чувства / Е. П. Ильин. – СПб. : Питер, 2001. – 752 с.
3. *Кубрякова, Е. С.* Язык и знание: На пути получения знаний о языке: Части речи с когнитивной точки зрения. Роль языка в познании мира / Е. С. Кубрякова. – М. : Яз. слав. культуры, 2004. – 560 с.
4. Стыд [Электронный ресурс] // Большая психологическая энциклопедия. – Режим доступа: https://rus-big-psyho.slovaronline.com/7289-D1%81%D1%82%D1%8B%D0%B4. – Дата доступа: 27.08.2022.


*М. А. Падольскі (Беларусь)*

# АСОБА МАКСІМА ТАНКА Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ. МЯДЗЕЛЬСКІ РАЁН»

Максім Танк – адзін з вядомых, знакавых паэтаў беларускай літаратуры. Як адзначаў Зіновій Прыгодзіч, «Яўген Іванавіч быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Дасягнуў гэтага дзякуючы самаадукацыі – усё сваё жыццё ён апантана вучыўся. Здзіўляе, уражвае колькасць імёнаў пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, даследчыкаў і іншых асоб, прыведзеных у яго дзённіках. А колькасць думак, выказаных ім у шматлікіх запісах, лістах, публічных выступах, – гэта сапраўдныя залатыя россыпы» [3].

Бібліяграфія, прысвечаная аналізу творчасці паэта, складаецца з соцень артыкулаў, манаграфій, падручнікаў. Аднак сярод іх не было спецыяльных даследаванняў, прысвечанных разгляду асобы паэта ў кнізе «Памяць».

Задача артыкула – устанавіць, што можа даведацца пра Максіма Танка чытач у кнізе «Памяць. Мядзельскі раён», якая ўваходзіць у серыю выданняў, распачатую ў 1985 годзе.

Серыя складаецца з выданняў аб 118 раёнах краіны. Асобным раёнам у залежнасці ад аб'ёму прадстаўленай інфармацыі прысвечана не адно, а некалькі выданняў. Мэта праекта – расказаць пра гісторыю ўсіх раёнаў Беларусі, іх археалогію, гісторыка-палітычныя і культурнае развіццё, вядомых людзей, прадставіць звесткі аб асноўных падзеях Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі кожнай вобласці [2].

Кніга, прысвечаная Мядзельскаму раёну [1], выпушчана ў свет у 1998 годзе аб'ёмам 640 старонак выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Складаецца з 13 раздзелаў: уступнага артыкула «Роднай Мядзельшчыне», «Населеныя пункты Мядзельскага раёна», «Населеныя пункты Мядзельскага раёна, якія не існуюць», «Зямля нашых продкаў», «У складзе Полацкага княства», «У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай», «У складзе Расійскай імперыі», «На крутым павароце гісторыі», «Ішла вайна народная», «Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі пры абароне і вызваленні Мядзельскага раёна і пахаваныя на яго тэрыторыі», «Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Партызаны, падпольшчыкі, удзельнікі антыфашысцкага руху і падполля, члены іх сем'яў і мірныя жыхары – ахвяры фашысцкага тэрору», «Мірныя жыхары яўрэйскай нацыянальнасці – ахвяры фашысцкага тэрору», «Пад мірным небам», «Вызначыліся працай», «Ганарыцца Мядзельшчына сваімі землякамі», «З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны», «З гісторыі населеных пунктаў». Асоба М. Танка выяўляецца ў двух артыкулах: «Роднай Мядзельшчыне» (напісаны М. Танкам 1 студзеня 1994 года ў Мінску прыкладна за год да яго смерці) [1, с. 17] і «Пясняр з Нарачанскага краю» [1, с. 397–404] з раздзела «Ганарыцца Мядзельшчына сваімі землякамі». У раздзеле «З гісторыі населеных пунктаў» згадваецца вёска Пількаўшчына – месца, дзе нарадзіўся М. Танк [1, с. 609].

З уступнага артыкула бачна, што паэт выдатна валодае мастацкім беларускім словам, пра што сведчаць вобразныя эпітэты і метафары «цепліцца любоў», «задзірванелыя акопы і бліндажы», «патанаючыя вобразы», «абеліскі ратнай славы». М. Танк успамінае знакавыя мясціны, падзеі, якія адбываліся ў яго краі (курганы-валатоўкі, замкі, паўстанні, Вялікую Айчынную вайну). Асобна выдзяляецца ўспамін, як у 1943 годзе яму прыйшоў ліст па партызанскай пошце, дзе работнік падпольнага Вілейскага абкама Андрэй Бураў пісаў: «Нельга ў словах перадаць палаючай Нарачы… і дзень і ноч яна стагне…». У лісце гаварылася аб спаленых вёсках, забітых мірных жыхарах. Кожны радок гэтага пісьма с болем адклікаўся ў сэрцы паэта. Можна зразумець, што М. Танк любіць свой родны край, ведае яго гісторыю, а таксама не губляе сувязь з роднымі мясцінамі ў складаныя часы вайны. Паэт назваў кнігі серыі «Памяць» «прыкметным самацветам на мазаічнай карце Беларусі».

У раздзеле «Ганарыцца Мядзельшчына сваімі землякамі» першы артыкул «Пясняр з Нарачанскага краю» прысвечаны М. Танку. Гэтая назва таксама носіць вобразны характар і часта згадваецца пры ўпамінанні Максіма Танка ў іншых

работах. Матэрыял напісаны В. П. Рагойшам – беларускім літаратуразнаўцам, крытыкам, заслужаным работнікам адукацыі, доктарам філалагічных навук, прафесарам.

У артыкуле прысутнічае некалькі фатаграфій: хата, у якой нарадзіўся Максім Танк, Максім Танк на Радзіме (1965), ліст Максіма Танка сябрам-землякам (1982). Фотаздымкі яшчэ раз падкрэсліваюць асобую любоў паэта да родных мясцін.

Артыкул умоўна можна падзяліць на дзве часткі: першая частка прысвечана біяграфіі і дасягненням паэта. У самым пачатку адзначаюцца ўсе званні і пасады (народны паэт Беларусі, акадэмік АН Беларусі, Герой Сацыялістычнай працы, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і БССР, старшыня Вярхоўнага Савета БССР). Цікавы і той факт, што сапраўднае прозвішча паэта яго аднавяскоўцы вымаўляюць з націскам на першы склад (Ску́рка). Далей згадваецца кароткая біяграфія: ён змяніў некалькі школ, уступіў у члены падпольнай камсамольскай арганізацыі і пачаў актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, быў выключаны з адной школы за ўдзел у забастоўцы, з другой – за вальнадумства і непаслушэнства, далей паэт пачаў супрацоўнічаць з нелегальным друкам, неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі і прыгаворваўся да розных тэрмінаў. З перапынкамі прасядзеў у турмах у агульнай складанасці каля двух гадоў. М. Танк паўстае чалавекам са сваімі непарушнымі ідэаламі, з цвёрдай псіхікай. Пасля вайны працаваў рэдактарам, быў старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, атрымаў мноства прэмій і ўзнагарод. Гэта паказвае, што ён быў добрым кіраўніком і лідарам.

Другая частка прысвечана творчасці паэта. У ей В. П. Рагойша задаецца пытаннем: «Чым жа ўсё-такі вызначаецца творчасць М. Танка?» Бо можна заўважыць, што яго творчасць яшчэ пры жыцці стала беларускай літаратурнай класікай.

Даследчык паспрабаваў вылучыць асноўныя лейтматывы ў творчасці паэта. Першым з іх з’яўляецца вобраз шляху, дарогі. Глыбока сімвалічна, што першая кніга паэта называлася «На этапах». Аднак ёсць усё ж самая галоўная дарога, па якой Максім Танк крочыў не адзін дзясятак гадоў, – гэта дарога вернасці, вернасці Радзіме. Гэта другі лейтматыў. У паэзіі Танка знайшла адлюстраванне беларуская шматпакутная гісторыя, яе рэальныя факты.

Яшчэ адным лейтматывам творчасці паэта з’яўляецца вобраз маці. «Маці для паэта – увасабленне і адначасова прыклад чалавечай дабрыні, працавітасці».

Бацькаўшчына ў паэзіі Максіма Танка, у першую чаргу, якраз і ўвасабляецца, канкрэтызуецца ў вобразе маці, якая дае пачатак усяму на зямлі. Разам з тым, Радзіма ў паэта асацыюецца яшчэ з адным паняццем – роднай песняй. Аднак ёсць у паэзіі М. Танка яшчэ адзін вобраз, які таксама ўвасабляе сабой Радзіму, – гэта вобраз сасны. Ён сустракаецца ў творчасці паэта вельмі часта.

Далей ідзе аналіз «лірычных перажыванняў» паэта. На думку В. Рагойшы, «па сваім светаадчуванні, светаразуменні, мастацка-вобразнай палітры, манеры думаць і гаварыць Максім Танк найперш вясковы, сялянскі паэт. Сялянства, якое да апошняга часу па сваёй колькасці пераўзыходзіла ўсе іншыя сацыяльныя слаі

Беларусі, з’яўляецца і сёння асноўным захавальнікам беларускага менталітэту. І таму яскравае выяўленне Максімам Танкам сялянскасці яго светапогляду – гэта адначасова і выяўленне беларускасці». Для Максіма Танка прыгажосць і дабрыня – якасці непадзельныя. Самае светлае, запаветнае, высоканароднае знаходзіла ў пасляваенны час водгук у яго лірыцы. Але ў яго творчасці прысутнічалі сарказм і сатыра. Сатыру Танк скіраваў перш за ўсё супраць ворага нумар адзін – мяшчанства. Але мяшчанства, на думку паэта, – не нейкая грамадская катэгорыя, а маральнае спусташэнне чалавека. Змагаючыся са злом, М. Танк застаўся верным самому сабе: сцвярджаў дабро, служыў тым жа высокім ідэалам, што і ў сваіх лірычных творах.

Далей В. Рагойша ўспамінае, як бываў на Радзіме паэта: «Пра Максіма Танка напісана ўжо даволі шмат. Нямала напісаў і я сам. Але толькі пасля пабыўкі на Нарачаншчыне, пасля сустрэч і размоў з тутэйшымі людзьмі, гутарак з роднымі паэта і з ім самім, толькі пасля ўбачанага і перажытага на мядзельскай зямлі па-сапраўднаму зразумеў характар глыбіннай народнасці Максіма Танка».

Напрыканцы артыкула расказваецца пра твор Максіма Танка «Гісторыі вескі Пількаўшчына», некаторыя моманты ў ім пераклікаюцца з сапраўднай гісторыяй усёй Беларусі, а за знешней гумарыстычная формай падачы матэрыялу праглядваюць зусім не смешныя, больш таго – драматычныя факты гэтай гісторыі, якія хвалююць і сёння.

У заключэнні В. Рагойша выказвае надзею, што праз нейкі час мы будзем прыязджаць у Пількаўшчыну – у літаратурны музей народнага паэта Беларусі Максіма Танка. Але да гэтага часу такого музея на Пількаўшчыне не існуе.

Максім Танк – духоўна сталая асоба высокай інтэлектуальнай арганізацыі, патрыёт, напрацягу ўсяго жыцця заставаўся верным сваім ідэалам. Ён здолеў дасягнуць такіх высот, бо пісаў на зразумелай для простага народа мове, быў з ім псіхалагічна роўным. Калі перадрукоўваць артыкул «Пясняр з Нарачанскага краю», можна больш падрабязна расказаць пра творчасць паэта (больш пра канкрэтныя творы, а не толькі лейтматывы). Яго паэзія мела вялікае значэнне для развіцця беларускай літаратуры не толькі ў мастацкім, але і нацыянальным сэнсе: ён шмат зрабіў для папулярызацыі беларускай мовы, перакладаў на яе кнігі і стараўся ўсяляк яе развіваць.

## Літаратура

1. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Мядзельскага раёна. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1998. – 640 с.
2. *Подольский, Н. А.* Хронология издания серии книг «Память» в Республике Беларусь / Н. А. Подольский // 70-я научно-техническая конференция учащихся, студентов и магистрантов, Минск, 15–20 апр. 2019 г. : сб. науч. работ. – Минск, 2019. – С. 740–743.
3. *Пригодич, З.* Воспоминания о Максиме Танке [Электронный ресурс] / З. Пригодич. – Режим доступа: https://zviazda.by/ru/news/20191202/1575278530-zinoviy-prigodich-vospominaniya-omaksime-tanke. – Дата доступа: 10.09.2022.